# СПАДЧЫНА АБ'ЯДНОЎВАЕ

## У Мінску распачаўся VIII Беларускі міжнародны медыяфорум

**Адкрыццё форуму, які сёлета будзе працаваць да 25 мая пад назвай "Партнёрства ў імя будучыні: гісторыка-культурная спадчына як фактар яднання", прайшло ўчора ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Удзел у медыяфоруме бяруць гэтым разам 15 дзяржаў, перад якімі стаіць задача распрацаваць адзіную стратэгію па падтрымцы культурнай і гістарычнай спадчыны ўсіх краін, наладзіць канструктыўны дыялог культур і сфарміраваць адзіную гуманітарную прастору.**




Тэмай форуму нездарма стала гісторыка-культурная спадчына. Менавіта культура з'яўляецца самым магутным механізмам усталявання паразумення паміж рознымі народамі. І толькі прызнаўшы каштоўнасць і ўнікальнасць кожнай культуры, традыцый кожнага народа, можна дабіцца росквіту культуры ўласнай і наладзіць сапраўды культурны дыялог. Выдатна, што арганізатары медыяфоруму — Міністэрства інфармацыі Беларусі, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД, Беларускі саюз журналістаў — і замежныя ўдзельнікі разумеюць значнасць падтрымкі нацыянальных культур і недапушчальнасць уніфікацыі ў гэтай галіне. Гэтай высакароднай місіі стараюцца служыць і СМІ, не ў апошнюю чаргу для падтрымкі і развіцця якіх штогод ладзіцца форум.

— За час правядзення Беларускі медыяфорум стаў знакавай дыялогавай пляцоўкай, ён дазваляе не толькі эфектыўна абмяркоўваць актуальныя праблемы журналісцкай супольнасці краін СНД, але і выбудоўваць доўгатэрміновае плённае супрацоўніцтва ў медыйнай сферы на карысць нашых дзяржаў і народаў, — адзначыў **Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь.** — Мы дзелімся вопытам, канцэптуальнымі задумамі, ідэямі, кансалідуем сілы для вырашэння агульных праблем, тым самым фарміруючы адзіную інфармацыйную і гуманітарную прастору. У гэтай прасторы вечнымі каштоўнасцямі журналісцкай працы застаюцца адказнасць, увага да чалавека, вернасць грамадзянскаму доўгу. Мы ўсе разам выхоўваем сумленных і

адказных журналістаў. І сёння, у эпоху імклівага развіцця інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій, захаванне духоўнага падмурка з'яўляецца найважнейшым сацыяльным фактарам для паспяховага развіцця любога грамадства. Летапіс беларускай гістарычнай прасторы ў цэлым мае і светлыя, і трагічныя старонкі. Гістарычную праўду, светлую памяць пра подзвіг нашых бацькоў і дзядоў мы павінны не толькі беражліва насіць у сэрцах, але ўмець захоўваць у новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах.

У чатырохдзённага мерапрыемства вельмі шчыльны расклад. Учора для гасцей Мінска дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі правёў адмысловую экскурсію па бібліятэцы пад назвай "Кніжная спадчына Беларусі". Асобна вылучаецца тэма важнасці захавання гістарычнай праўды пра Вялікую Перамогу ў рамках эксперт-сесіі "Беларусь — старонкі мужнасці" ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага.



Сёння адбудзецца пленарнае пасяджэнне медыяфоруму ў Мірскім замку. У сценах помніка сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА адбудуцца абмеркаванні па наступных тэмах: "Дыялог культур — дыялог народаў", "Сродкі масавай інфармацыі: гістарычная місія ў захаванні і развіцці гісторыка-культурнай спадчыны", "Мова, нацыянальная літаратура як фактары суверэнітэту дзяржаў і яднання народаў". Гасцям прадэманструюць каларыт і традыцыі беларускай культуры падчас тэатралізаванай пастаноўкі "У славу МІРа".

Асобная ўвага будзе нададзена навучанню і павышэнню кваліфікацыі журналістаў. У фармаце прэс-клуба і "Культурнага марафону" пройдзе летняя школа журналістыкі на базе Інстытута журналістыкі БДУ. Удзельнікі форуму нарэшце абмяркуюць актуальныя для беларускай арт-журналістыкі тэмы: павышэнне прафесіянальнага ўзроўню журналістаў, якія пішуць пра культуру, і павышэнне прэстыжу "культурнай журналістыкі" наогул, а таксама прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем і дасягненняў культуры праз СМІ.

Асобна варта адзначыць, што ў рамках медыяфоруму ўпершыню ў Мінску пройдзе юбілейны X Міжнародны конкурс "Мастацтва кнігі" дзяржаў — удзельніц СНД.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**